

ПРА КАХАННЕ САПРАЎДНЫХ МУЖЧЫН **13**

ДОБРАГА ДАЖДЖУ ПАКУЛЬ НЕ БУДЗЕ **16**



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

+TV ПРАГРАМА

2 ЧЭРВЕНЯ 2023 г. ПЯТНІЦА № 104 (29984)

## КОРАТКА

● Беларусь павысіла экспартныя пошліны на нафту і нафтапрадукты.

● **У выстаўцы «Белагра» ў бягучым годзе возьмуць удзел 450 кампаній з 10 краін.**

● У Беларусі ўбрана амаль 79 працэнтаў плошчаў траў.

● **Больш за 650 тысяч турыстаў наведала асабліва ахоўныя прыродныя тэрыторыі Беларусі ў 2022 годзе.**

● Беларускія навукоўцы распрацоўваюць клетачныя прадукты для лячэння аўтаімунных і анказахворванняў.



● **Шымановіч і Марцінс выйшлі ў другі раўнд парнага разраду «Ралан Гарос».**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Дзмітрый ПІНЕВІЧ, міністр аховы здароўя:**

*«У гэтым годзе ў нас ужо будзе прыкладна 40 працэнтаў вырабаў медыцынскага прызначэння беларускай вытворчасці. Гэта і нашы расходныя матэрыялы, і новае абсталяванне, і гэтак далей. У лекавых прэпаратах — у нас больш як 50 працэнтаў. І задача стаіць яшчэ больш амбіцыйная. У нас, напрыклад, няма ўласнай вытворчасці імунабіялагічных прэпаратаў, новых прэпаратаў для анкалогіі. Стаіць задача будаўніцтва новых прадпрыемстваў, якія дазволілі б нам мець гэты спектр прадукцыі».*

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «У НАС РЫХТУЮЦЬ СІЛАВЫ СЦЭНАРЫЙ ЗМЕНЫ ЎЛАДЫ. МЫ ГЭТА БАЧЫМ. І МЫ ГЭТАГА НЕ ДАПУСЦІМ»

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з удзельнікамі 52-га пасяджэння Савета кіраўнікоў органаў бяспекі і спецыяльных службаў дзяржаў — удзельніц СНД. На парадку дня — ваенна-палітычная абстаноўка, пытанні бяспекі, супрацьстаянне выклікам і пагрозам. Тэма самая вострая, таму і размова атрымалася прамой і шчырай. «Я не першы раз ужо сустракаюся са спецыялістамі, кіраўнікамі (і ў рамках АДКБ, і ЕАЭС, і гэтак далей), заўсёды, зразумела, напярэдадні любога мерапрыемства думаеш пра галоўнае. Галоўнае ж заключаецца ў тым, што ўсе члены СНД вельмі сур'ёзна ўспрымаюць наш Савет. І тое, што ўсе кіраўнікі органаў бяспекі прыбылі ў Беларусь, сведчыць аб тым, што вы бачыце, што адбываецца вакол нашых граніц, нашай Садружнасці, і вы разумееце, што можа быць», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Ён звярнуў увагу, што палітыкі і эканамісты маглі сходзіцца і разыходзіцца, а спецслужбы заўсёды знаходзіліся ў цесным кантакце. Аляксандр Лукашэнка ўпэўнены, што такога падыходу трэба прытрымлівацца і цяпер.**



Фота БелТА.

### У ВІРЫ БУРНЫХ ПАДЗЕЙ

«Пасля таго як пачалася спецыяльная ваенная аперацыя ва Украіне і супраць Беларусі і Расіі пачалі ўводзіць маштабныя санкцыі, у нашых краінах сёй-той завагаўся, закруціўся, захістаўся і г. д. Гэта, напэўна, натуральна. Вельмі бурныя падзеі адбыліся імгненна, таму некаторы час трэба, каб ацаніць сітуацыю. Але спецыяльныя службы былі заўсёды ў кантакце. Яны дзейнічаюць спакойна, ціха, незаўважна, як і належыць спецыяльным службам. Захад аб гэтых кантактах мала ведае, таму не так шалее і менш прэтэнзій прад'яўляе да вас, нашых саюзнікаў. Ну, а мы з Расіяй апынуліся ў эпіцэнтры гэтых бурных падзей», — адзначыў Прэзідэнт. Ён заўважыў, што некаторыя краіны, якія завагаліся пасля пачатку спецыяльнай ваеннай аперацыі, не да канца разумеюць сутнасць гэтых падзей.

«Я абсалютна згодны з Прэзідэнтам Пуціным, калі ён гаворыць аб тым, што не мы пачалі гэту вайну. Яна пачалася нават не ў 2014 годзе. Яна пачалася задоўга да 2014 года. Мы бачылі ўсё, што тут адбывалася: той «карычневы» пераварот, які адбыўся, і да чаго Украіну падводзяць. Бачылі, хто быў у авангардзе», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён прывёў у прыклад Расію, дзе пачынаючы з 2014 года многія «свядомыя», як іх называюць у Беларусі, вылі, крычалі, стагналі, патрабуючы абараніць рускага чалавека на Данбасе. «Яны падштурхоўвалі да гэтага перш за ўсё. І ў нас таксама такія былі. Ну, абаранілі. І дзе гэтыя «свядомыя», разумныя, прасунутыя апынуліся? Хто праз Лачынскі калідор пабег, хто праз Беларусь спрабаваў бегчы, але, балазе, у нас з Расіяй жорсткія правілы... Пачынаюць асуджаць кіраўніцтва Расіі — хто з Ізраіля, хто з Грузіі. А чаго вы асуджаеце? Вы ўчора былі заўзятымі прыхільнікамі гэтай аперацыі. Уявіце сабе: калі б у Мексіцы пачалі здзекавацца з грамадзян ЗША, з амерыканцаў? Той Мексікі даўно б не існавала».

Беларускі лідар падкрэсліў, што ў кіраўніцтва Украіны было шмат варыянтаў зрабіць так, каб людзі жылі мірна. Але ні былыя прэзідэнты, ні цяперашні гэтым не скарысталіся. «Чаму не скарысталіся? Яны што, хацелі вайны? Не. Іх проста штурхалі да гэтага. Знайшлі болевыя кропкі, дзе можна было націснуць», — заявіў Аляксандр Лукашэнка. Кіраўнік дзяржавы ўпэўнены, што, калі б гэта не пачалося крыху больш за год таму, пачалося б заўтра, але ў больш горшых умовах для Расіі і Беларусі. Па яго словах, да гэтага ўсё ішло.

«Адзіная, напэўна, наша памылка, што мы не вырашылі гэта пытанне ў 2014-2015 гадах, калі не было ні арміі ва Украіны, ні гатоўнасці... Усе хацелі мірна неяк урэгуляваць. А яны за гэты час стварылі баяздольныя ўзброеныя сілы», — адзначыў Прэзідэнт. Прычым гэты намер ужо быў пацверджаны з боку ўдзельнікаў тагачасных перагавораў па мірным урэгуляванні, у тым ліку былым прэзідэнтам Францыі Франсуа Аландам. «Яны шчыра прызналіся, што яны рабілі ўсё, каб падрыхтаваць Украіну да вайны з Расіяй», — звярнуў увагу беларускі лідар.

СТАР. 2-3

Выпрабавана на сабе

# Патушыць пажар і знайсці чалавека



**Карэспандэнт «Звязды» правяла адзін дзень з ратавальнікамі**

**Падняцца на вышыню 14-павярховага дома, дзякуючы спецыяльнаму інструменту дэблакіраваць пацярпелага ў аўтамабільным ДТЗ, аказаць яму першую медыцынскую дапамогу, апрануцца за некалькі секундаў па трывозе і выехаць на месца здарэння, увайсці ў моцна задымленае памяшканне і патушыць пажар — далёка не поўны пералік таго, праз што давялося прайсці ўдзельнікам семінара для СМІ, арганізаванага Міністэрствам па надзвычайных сітуацыях. Вядома, хоць умовы, у якіх аказаліся журналісты і блогеры, былі набліжаныя да рэальных, усё было максімальна бяспечна, але і гэтага хапіла, каб уявіць, чым кожны дзень займаюцца ратавальнікі, зразумець, наколькі адказная і рызыкоўная ў іх прафесія.**

СТАР. 4

ISSN 1990 — 763X

23104

9 771990 763008

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Мы абяцаем нясумнае лета з любімай газетай

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!